MOST

# ПРАВІЛЫ ПАДАЧЫ ЗАЯВАК НА ЎДЗЕЛ У ПРАЕКЦЕ СТАЖЫРОВАК ДЛЯ БЕЛАРУСАЎ MOST+

Фінансуецца Еўрапейскім Саюзам

GOETHE INSTITUT Рэалізуецца Гётэ-Інстытутам

## Аб праграме MOST+

MOST+ – гэта праграма спрыяння прафесійнаму абмену паміж беларускімі прафесіяналам і іх калегамі з ЕС. Праект MOST+ будзе садзейнічаць развіццю мабільнасці і інтэрнацыяналізацыі беларускіх спецыялістаў і дапаможа ім інтэгравацца ў агульнаеўрапейскія прафесійныя супольнасц. Для выканання гэтых мэт праект MOST+ арыентуецца на стварэнне ўстойлівых кантактаў, развіццё плённага абмену вопытам і ведамі, а таксама прымяненне еўрапейскіх найлепшых практык і іншых фактараў поспеху ў розных сферах у Рэспубліцы Беларусь.

Праект MOST+ з'яўляецца пераемнікам праектаў MOST I і MOST II, якія з 2015 па 2020 год забяспечылі 4873 стажыроўкі для беларускіх спецыялістаў.

Праект MOST+ адкрывае беларускім спецыялістам яшчэ адну магчымасць для ўдзелу ў стажыроўках і іншых прафесійных паездках. Перыяд рэалізацыі праграмы - з лістапада 2022 па ліпень 2024 года.

## Якія сектары прафесійнай дзейнасці ахоплівае праграма MOST+?

Заяўку на атрыманне гранта могуць падаць спецыялісты, якія працуюць у наступных шасці сектарах:

- Грамадства (грамадзянская супольнасць, правы чалавека і СМІ)
- Культура (у шырокім разуменні, у тым ліку турызм, культурныя і крэатыўныя індустрыі)
- Бізнэс (малы і сярэдні бізнэс, інавацыйны бізнэс, у тым ліку IT)
- Адукацыя (пазафармальная і неакадэмічная, уключаючы бесперапынную адукацыю на працягу ўсяго жыцця)
- Ахова здароўя
- Устойлівае развіццё (арганічнае земляробства, ахова навакольнага асяроддзя, устойлівая энергетыка)

## Хто можа падаваць заяўкі?

Вы павінны быць грамадзянінам Рэспублікі Беларусь ва ўзросце ад 18 гадоў.

Вы павінны быць спецыялістам, які працуе ў адным з шасці пералічаных вышэй сектараў. Не прымаюцца заяўкі ад заяўнікоў, якія займаюцца названай дзейнасцю у якасці хобі.

Не прымаюцца заяўкі ад студэнтаў, якія яшчэ не скончылі навучанне і не атрымалі прафесію.

Вы можаце падаць заяўку індывідуальна ці ў складзе групы да пяці заяўнікоў. Мы просім групы колькасцю больш за 5 чалавек не падаваць некалькі заявак на адну і тую ж стажыроўку. Група — у дадзеным выпадку, гэта некалькі чалавек, якія падалі заяўку на адну прафесійную паездку для дасягнення падобных ці аднолькавых мэтаў, распрацоўкі агульнага праекта або аб'яднання сваіх узаемадапаўняльных навыкаў (напрыклад, музыкі ў аркестры). Група — гэта не проста суполка асобных персонаў або кампіляцыя індывідуальных заявак. Калі прысутнасць кожнага ўдзельніка групы не з'яўляецца відавочна апраўданай, такой групе будзе прапанавана выбраць аднаго ўдзельніка, які мог бы падзяліцца вынікамі сваёй мабільнасці з іншымі пасля вяртання з паездкі. Усе чальцы групы павінны быць грамадзянамі Беларусі.

Вашай краінай пражывання можа быць Беларусь ці любая іншая краіна. Краіна пражывання – гэта краіна, якую заяўнік лічыць краінай свайго сталага жыхарства. Яна можа адрозніваецца ад пазначанага ў пашпарце месца рэгістрацыі.

Не прымаюцца заяўкі ад фізічных асоб і супрацоўнікаў устаноў, якія падпадаюць пад рашэнні Савета міністраў замежных спраў ЕС датычна Рэспублікі Беларусь і пад адпаведныя санкцыі, накладзеныя на фізічных асоб і арганізацыі.

## Якія паездкі падтрымліваюцца праграмай MOST+?

Пры дапамозе гранта на забеспячэнне стажыроўкі вы можаце наведаць краіны ЕС **з адной з названых ніжэй мэт:**

- Усталяваць партнёрскія адносіны ў сваёй прафесійнай сферы
- Пашырыць свае міжнародныя прафесійныя кантакты
- Распрацаваць сумесны праект
- Прэзентаваць сваю працу ці паслугі
- Даведацца пра важныя дасягненні ў вагым сектары і падзяліцца з шырокай аўдыторыяй сваімі практыкамі і досведам
- Здзейсніць  вучэбна-азнакамляльную вандроўку ці візіт па абмене досведам
- Прайсці навучанне на трэнінгу або воркшопу
- Прыняць удзел у стажыроўцы
- Іншыя мэты, якія дапамогуць вам інтэгравацца ў еўрапейскія прафесійныя супольнасці.

Ваша паездка павінна быць непасрэдна звязана са сферай вашай прафесійнай дзейнасці і садзейнічаць прафесійнаму росту. Удзел павінен быць актыўным (напрыклад, калі вы плануеце паўдзельнічаць у публічным мерапрыемстве, заплануйце выступленне, а не проста прысутнасць на  мерапрыемстве ў якасці слухача).

MOST+ накіраваны на стварэнне партнёрскіх стасункаў, таму заяўнікі павінны ўключыць у праграму паездкі сустрэчы, планы па распрацоўцы сумесных праектаў з іншымі

прафесіяналамі з ЕС і г. д. Простае наведванне канферэнцыі не азначае, што вы маеце намер арганізаваць партнёрства.

Вынікі вашай стажыроўкі павінны прынесці карысць для іншых беларускіх спецыялістаў з вашага сектара. Чакаецца, што магчымым мультыплікацыйным эфектам ад паездкі можа быць распаўсюджванне вынікаў мабільнасці прынамсі ў прафесійнай суполцы беларусаў з атачэння заяўнікоў і, наколькі гэта магчыма, з пашыраным колам прафесіяналаў. Бенефіцыярам прапануецца апісаць у сваёй заяўцы метады або крокі па арганізацыі такога распаўсюджвання пасля вяртання з паездкі, у адпаведнасці з іх прафесійным кантэкстам, найбольш эфектыўным чынам.

## Якія магчымы фарматы і працягласць паездак?

Вы можаце падаваць заяўкі на паездкі розных тыпаў працягласцю да 90 дзён (уключаючы час у дарозе), для правядзення ўказанай ніжэй дзейнасці:

- Удзел у канферэнцыях, кангрэсах, форумах, міжнародных ці іншых галіновых мерапрыемствах (як правіла, гэта кароткатэрміновая паездкі)
- Вучэбна-азнаякамляльныя паездкі або візіт па абмене
- Праходжанне стажыроўкі, трэнінга, воркшопа
- Пакздка ў некалькі краін ці ў некалькі этапаў
- Візіты партёраў з ЕС (да 6 дзён).
- Мабільнасць анлайн
- Любыя іншыя фарматы, якія вы можаце арганізаваць для дасягнення вышэй названых мэт, у межах праграмы.

**Кароткатэрміновая мабільнасць** у асноўным прызначана для наведвання канферэнцый, семінараў або воркшопаў. Гэты фармат, звычайна, дапамагае наладзіць кантакты з іншымі людзьмі з адпаведнага сектара, а таксама атрымаць водгукі пра уласныя праекты ці іншую актуальную інфармацыю.

**Азнакамляльныя паездкі або паездкі па абмене** даюць магчымасць больш інтэнсіўна вывучыць пэўную тэму, абмяняцца прафесійным досведам, папрацаваць над сумеснымі праектамі з адным або некалькімі партнёрамі з ЕС.

**Доўгатэрміновая мабільнасць** прапануе зацікаўленым удзельнікам магчымасць вывучыць або даследаваць тэму, якая прадстаўляе прафесійны інтарэс, распрацаваць канкрэтны праект з адным або некалькімі партнёрамі з ЕС або прайсці стажыроўку.

**Сесіі трэнінгаў** асабліва падыходзяць для тых, хто хоча падвысіць сваю кваліфікацыю або развіць навыкі ў сваёй спецыялізацыі, напрыклад, падчас вакацыяў. У межах гэтага фармата мабільнасці можна паляпшаць свае "хард і софт скілз".

**Паездка ў некалькі краін ці ў некалькі этапаў** – гэта,  звычайна, паездкі ў некалькі краін у некалькі этапаў. Гэты фармат дазваляе наведаць да трох розных краін Еўрасаюза (максімум у два этапы, цягам 6 месяцаў), што дае магчымасць надоўга не адрывацца ад свайго працоўнага месца. Гэты фармат прадугледжвае добра прадумаць план работы і сфармуляваць прамежкавыя мэты.

**Візіты партнёраў з ЕС.** Паездка да 6 дзён. Гэты фармат дазваляе партнёрам з ЕС наведаць сваіх беларускіх калег на іх радзіме або ў краіне іх пражывання са зваротным візітам. Гэты фармат дапаможа не толькі даць уяўленне партнёрам аб працы беларускіх калег, але і ўмацаваць прафесійныя кантакты.

**Анлайн-мабільнасць** не прадугледжвае паездак, але дазваляе паўдзельнічаць у анлайн-мерапрыемствах і трэнінгах, якія арганізуюцца ў краінах ЕС. Гэтая катэгорыя пакрывае аплату рэгістрацыйных унёскаў.

**Гібрыдныя ці іншыя фарматы,** якія вы маглі б распрацаваць у межах правілаў праграмы. Такія паездкі могуць мець некалькі мэтаў, але не павінны доўжыцца больш за 90 дзён, а таксама мусяць быць цесна звязанымі з вашым прафесійным сектарам.

## Калі пачнуцца стажыроўкі і якія ў іх тэрміны?

Паездка мусіць цягнуцца ад 3 да 90 дзён (улічваючы час у дарозе).
Заяўкі на стажыроўкі прымаюцца бесперапынна, г.зн. без прамежкавых дэдлайнаў для падачы заявак.

| | Дата |
|---|---|
| Пачатак прыёму заявак | 9 снежня 2022 г. |
| Самая ранняя магчымая дата пачатку праектаў мабільнасці | Студзень 2023 г. |
| Апошняя магчымая дата завяршэння праектаў мабільнасці | 18 жніўня 2024 г. |
| Апошні тэрмін падачы заявак | 3 чэрвеня 2024 г. (15:00 па беларускім часе) |
| Наступныя кансультацыі для заяўнікоў: глядзіце на сайце MOST+ ( www.mostplus.eu) | |

Улічваючы працэс ацэнкі заявак (да аднаго месяца) і час, неабходны для заключэння кантрактаў, пераводу сродкаў і арганізацыі паездак (некалькі тыдняў), заяўкі трэба падаваць не пазней за 2 месяцы да запланаванага пачатку стажыроўкі (за 3 месяцы ў выпадках, калі патрэбна віза). Гэта – патрабаванне, а не проста рэкамендацыя. Невыкананне гэтай умовы з'яўляецца асноўнай прычынай адхілення заявак.

Вы можаце пачынаць рэалізоўваць ваш праект стажыроўкі ТОЛЬКІ ПАСЛЯ падпісання пагаднення аб прадастаўленні гранта!

## Якія краіны можна наведваць?

Прафесійныя паездкі і стажыроўкі можна планаваць толькі ў краіны Еўрапейскага Саюза:
Аўстрыя, Балгарыя, Бельгія, Венгрыя, Германія, Грэцыя, Данія, Ірландыя, Іспанія, Італія, Кіпр, Латвія, Літва, Люксембург, Мальта, Нідэрланды, Польшча, Партугалія, Румынія, Славакія, Славенія, Эстонія, Фінляндыя, Францыя, Харватыя, Чэхія, Швецыя.

Краіны прызначэння (куды ладзіцца паездка) павінны адрозніваца ад краіны пражывання заяўніка. *Прыклад: Вольга цяпер пастаянна пражывае ў Варшаве (Польшча), але паехаць на стажыроўку ў Кракаў яна не можа. Аднак яна можа выбраць у якасці краіны прызначэння любую з астатніх 26 дзяржаў Еўрапейскага саюза.*

## Карысна ведаць

- У межах праграмы MOST+ вы можаце прыняць удзел максімум у двух стажыроўках (і толькі ў адной, калі раней вы ўжо ўдзельнічалі ў папярэдніх этапах MOST I і II).
- Калі ваша заяўка была адхілена, вы можаце падаваць заяўку на іншую стажыроўку.
- Адначасова можна падаць толькі адну заяўку. Вы можаце паўторна падаць заяўку на тую ж самую ці іншую паездку толькі пасля атрымання вынікаў ацэнкі вашай папярэдняй заяўкі.
- Такая прафесійная паездка з'яўляецца актыўнасцю на поўны працоўны дзень і не можа ажыццяўляцца сумесна з іншымі відамі дзейнасці (стажыроўкамі, навучаннямі або мабільнасцямі, якія пакрываюцца іншымі праграмамі, працай і да т.п.).
- Падвойнае і скрыжаванае фінансаванне вашай паездкі забаронена: адна і тая ж мабільнасць не можа пакрывацца дзвюма рознымі праграмамі, грантамі ці стыпендыямі. Таксама забаронена, калі адна ініцыятыва пакрывае адны выдаткі на паездку, а іншыя выдаткі пакрываюцца іншай ініцыятывай. Беларускія спецыялісты могуць падаць заяўку на ўдзел у адной і той жа мабільнасці ў дзве розныя грантавыя праграмы, але яны абавязаны неадкладна праінфармаваць абедзве праграмы пасля атрымання гранта ад любой з іх.

## Хто рыхтуе маю паездку?

Заяўнік самастойна рыхтуе сваю паездку:

- Наладжвае кантакты і дамаўляецца з прымаючым бокам пра візіт (да 10 арганізацый на адзін праект стажыроўкі).
- Складае план дзейнасці і маршрут паездак падчас стажыроўкі. Кожны дзень і кожная актыўнасць у гэтай праграме мусяць быць дасканала абгрунтаваны.

Заяўнік адказвае за атрыманне віз, неабходных яму(ёй) для вандроўкі ў ЕС, і іншых неабходных для вандроўкі дакументаў (напрыклад, пашпарта, страхавання здароўя, медыцынскіх тэстаў). Таму зацверджаным заяўнікам мы настойліва раім загадзя зрабіць усе крокі, неабходныя для атрымання візы. Па патрабаванні праграма MOST+ можа выдаць пісьмовае пацверджанне таго, што бенефіцыяр удзельнічае ў праграме, і гэты ліст заяўнік прыкладае да сваёй заяўкі на візу. Памятайце, што на атрыманне такога пацверджання спатрэбіцца да пяці працоўных дзён.

## Якія выдаткі пакрываюцца грантам?

- Выдаткі на праезд ад месца жыхарства ў краіну прызначэння, г.зн. у месца, дзе праходзіць стажыроўка (квіткі на аўтобус/цягнік/самалёт у эканом-класе набывае праект MOST+ пасля ўзгаднення з атрымальнікам гранта). Паездка ў краіну прызначэння на індывідуальным транспарце (аўтамабілі і да т.п.) дазволена, але MOST+ не можа пакрыць спадарожныя выдаткі (арэнда аўтамабіля, бензін, паркоўку, дарожныя зборы, страхаванне аўтамабіля, амартызацыйныя выдаткі і г.д.) і Гётэ-Інстытут вызваляецца ад любой адказнасці, якая можа ўзнікнуць у сувязі з выкарыстаннем заяўнікам індывідуальных транспартных сродкаў. Заяўнік, які вырашыў выкарыстоўваць індывідуальны транспарт, павінен пісьмова паведаміць Гётэ-Інстытуту пра сваё рашэнне да падпісання дамовы аб мабільнасці і пераканацца, што ўласны транспартны сродак адпавядае тэхнічным патрабаванням ЕС і патрабаванням страхавога пакрыцця ў ЕС.
- Перамяшчэнне паміж гарадамі ў краіне/краінах прызначэння (толькі эканом-класам, паездкі ў першым класе ці бізнес-класе не пакрываюцца).
- Выдаткі на знаходжанне або "суткавыя", што могуць быць кампенсаваны падчас паездкі, якая ажыццяўляецца па-за межамі звычайнага месца жыхарства. Суткавыя - гэта максімальная фіксаваная стаўка, якая пакрывае выдаткі на пражыванне. Сюды ўваходзяць пражыванне, харчаванне, паездкі на гарадскім або прыгарадным транспарце, у тым ліку праезд у аэрапорт і назад. Такім чынам, кошт праезду ў таксі пакрываецца суткавымі. Велічыня суткавых рэгулюецца нормамі Еўрапейскага Саюза ў залежнасці ад краіны прызначэння.

| Краіна Еўрасаюза | Велічыня суткавых (€) |
|---|---|
| Аўстрыя | 225 |
| Бельгія | 232 |
| Балгарыя | 227 |
| Харватыя | 180 |
| Чэхія | 230 |
| Кіпр | 238 |
| Данія | 270 |
| Эстонія | 181 |
| Фінляндыя | 244 |
| Францыя | 245 |
| Германія | 208 |
| Грэцыя | 222 |
| Венгрыя | 222 |
| Ірландыя | 254 |
| Італія | 230 |
| Латвія | 211 |
| Літва | 183 |
| Люксембург | 237 |
| Мальта | 205 |
| Нідэрланды | 263 |
| Польшча | 217 |
| Партугалія | 204 |
| Румынія | 222 |
| Славакія | 205 |
| Славенія | 180 |
| Іспанія | 212 |
| Швецыя | 257 |

Правілы разліку суткавых: Суткавыя выплачваюцца зыходзячы з колькасці начэй, праведзеных у паездцы па-за межамі месца жыхарства. Час у дарозе з'яўляецца часткай паездкі. Прымальна запытваць суткавыя і ў тых выпадках, калі для паездкі ў краіну стажыроўкі трэба правесці ноч у трэцяй краіне.

У выпадку, калі пражыванне прадастаўляецца заяўніку бясплатна прымаючай арганізацыяй у ЕС або ўваходзіць у кошт унёска за ўдзел, які будзе пакрыты MOST+, памер суткавых будзе зменшаны на 50%.

Для стажыровак працягласцю больш за 14 начэй запар у адной краіне суткавыя з 15-ай ночы разлічваюцца наступным чынам: велічыня дзеючых у адпаведных краінах ЕС суткавых X 0,25 X колькасць начэй у краіне прызначэння (удзельнікам доўгатэрміновых паездак прапануецца арганізаваць сабе эканомнае пражыванне, у тым ліку арэнду жылля, звярнуўшыся за падтрымкай да

прымаючых арганізацыяў у ЕС, каб знайсці альтэрнатыву гасцініцы і г.д. (Прыклад: Зміцер едзе ў 60-дзённую паездку ў Балгарыю. Паводле нормаў ЕС стаўка суткавых ЕС для Балгарыі складае 227 еўра. Такім чынам, Зміцер агулам за сваю мабільнасць атрымае суткавыя ў памеры 5788,50 еўра. Яны разлічваюцца наступным чынам: 227*14 (=3.178) + 227*46*0,25 (=2.610,50) = 5.788,50).

У выпадку паездкі па некалькіх краінах, суткавыя залежаць ад колькасці начэй, праведзеных за адно наведванне у кожнай краіне. Прыклад: Вольга едзе на стажыроўку ў Францыю (5 сутак) і ў Польшчу (10 сутак), плюс адну ноч (20 гадзін) яна правядзе ў Вільні (Літва), адкуль плануецца яе рэйс у Францыю. Суткавыя разлічваецца наступным чынам: 163x1 = 163 еўра за знаходжанне ў Літве, плюс 268x5 = 1340 еўра за знаходжанне ў Францыі, і 170x10 = 1700 еўра за знаходжанне ў Польшчы. Агульны памер суткавых Вольгі на стажыроўцы: 3203 еўра).

- Рэгістрацыйныя ўнёскі (напрыклад, унёскі за ўдзел у канферэнцыях ці кангрэсах) ці унёскі за навучанне;
- Візавы збор
- Страхаванне здароўя. У дыяпазоне бягучых цэн на медыцынскую страхоўку ў краінах Шэнгенскай зоны, якая набываецца ў страхавых кампаніях Беларусі: 3-4 еўра на 7 дзён, 4-5 еўра на 14 дзён, 11-13,5 еўра на 90 дзён;
- Магчыма фінансаванне дадатковых выдаткаў, звязаных з інваліднасцю;
- Калі ў вас ёсць асаблівыя патрэбы (напрыклад, дадатковы багаж з матэрыяламі, патрэбнымі для дасягнення мэтаў вашай стажыроўкі), вы можаце атрымаць дадатковае фінансаванне. Магчымы таксама друк улётак ці візітовак для дапамогі ў «прасоўванні» або «сеткавым супрацоўніцтве» і г. д. Раздрукоўка пэўных матэрыялаў таксама дапускаецца, аднак толькі калі гэта неабходна для паспяховага праходжання мабільнасці і калі гэта не падпадзе пад неабгрунтаваныя выдаткі ў межах агульнага бюджэту мабільнасці.
- Паездка ў Маскву па візу для стажыроўкі можа лічыцца асаблівай патрэбай, калі візавы аддзел краіны прызначэння, які выдае візы беларусам, знаходзмццаў Маскве (фінансуецца да 150 еўра на чалавека). Спіс дадатковых выдаткаў і іх апісанне павінен быць уключаны ў бюджэт паездкі.
- Усе пазначаныя вышэй выдаткі могуць быць кампенсаваны ТОЛЬКІ ПА ПРАДАСТАЎЛЕННІ ПАЦВЯРЖАЛЬНЫХ ДАКУМЕНТАЎ (квіткі, чэкі, пацверджанні аплаты, квітанцыі і да т.п.).

    Пацвярджаючымі дакументамі з'яўляецца інвойс (рахунак-фактура, дзе дакладна пазначана, за што павінна праводзіцца аплата) **РАЗАМ** з пацвярджэннем аплаты.

    Пацвярджэннем аплаты могуць быць:
    - У выпадку аплаты банкаўскім пераводам ці аплаты карткай або (1) выпіска аб транзакцыі, выдадзеная банкам, або (2) копія выпіскі з рахунка, у якой дакладна пазначаны імя ўладальніка банкаўскага

рахунка, сума аплаты і кароткае апісанне атрыманай паслугі ці набытага тавару, або (3) скрыншот аб транзакцыі з вашай банкаўскай праграмы-дадатку;
- У выпадку аплаты наяўнымі: касавы чэк.

Важная інфармацыя: бенефіцыяры праграмы самі нясуць адказнасць за аплату падаткаў, звязаных з атрыманнем гранта. Грант выплочваецца толькі ў еўра. Бенефіцыяры, якія пазначаюць банкаўскія рахункі ў іншых валютах, самі пакрываюць дадатковыя выдаткі, звязаныя з канвертацыяй валют.

## Якія выдаткі НЕ ПАКРЫВАЮЦЦА грантам?

- Выдаткі, не ўказаныя ў прыкладзеным да заяўкі бюджэце стажыроўкі
- Выдаткі, якія не маюць прамой сувязі з вандроўкай (падарункі, арганізацыя вольнага часу і да т.п.)
- Выдаткі, ужо пакрытыя іншымі грантамі і праграмамі
- Выдаткі, панесеныя да падпісання пагаднення аб прадастаўленні гранта
- Выдаткі на стажыроўкі, якія ўжо адбыліся.

## Як падаць заяўку на грант?

Каб атрымаць грант па праграме MOST+, вы павінны падаць заяўку анлайн на партале падачы заявак Гётэ-Інстытута (Goethe-Application Portal - GAP) разам з неабходнымі пацвярджальнымі дакументамі.

**Дадатак 1** «Запрашэнне ад прымаючай арганізацыі, праграма канферэнцыі або іншае пацвярджэнне наяўнасці праграмы стажыроўкі» (па адным запрашэнні ад кожнай прымаючай арганізацыі);
**Дадатак 2** «Рэзюмэ» – запампуйце сваё актуальнае рэзюмэ або скарыстайцеся гэтым узорам;
**Дадатак 3** «Дазвол выплачваць грант на забеспячэнне стажыроўкі па праграме MOST+ трэцім асобам» (калі гэта актуальна для вас, скарыстайцеся гэтым узорам).

## Дапамога з падрыхтўкай заяўкі

Вы хочаце ўдзельнічаць у стажыроўках, выканаць усе ўмовы праграмы для атрымання гранта на такую паездку, але не маеце кантактаў у Еўрасаюзе, не ведаеце як знайсці партнёра ці прымаючую арганізацыю з ЕС, не ўяўляеце ў якую краіну паехаць або які фармат паездкі выбіраць…? MOST+ можа дапамагчы! Напішыце нам электронны ліст, падаўшы як мага больш падрабязнай інфармацыі пра сябе, свае кар'ерныя планы, свае прафесійныя мэты, пра тое, што вы чакаеце ад прафесійнай паездкі ў Еўрасаюз. Не забудзьцеся прымацаваць да ліста сваё рэзюмэ. Дашліце ўсё гэта па адрасе:

infomobility@goethe.de , указаўшы ў тэме ліста «**Matchmaking**». Мы перашлем ваш запыт беларускаму спецыялісту з вашага сектара, які падрыхтуе ліст з ідэямі і прапановамі для вашай паездкі і магчымых партнёраў з ЕС. Вы атрымаеце такі адказ праз некалькіх тыдняў.

## На якой мове падаецца заяўка

Заяўку, суправаджальныя дакументы і справаздачы можна падаваць на беларускай, англійскай ціркускаймовах. Правілы ўдзелу ў праекце таксама існуюць на трох мовах.

## Тэхнічная інфармацыя аб запаўненні электроннай заяўкі

- Спачатку неабходна зарэгістравацца як фізічная асоба на партале падачы заявак (Goethe-Application Portal – GAP),
- Для рэгістрацыі на партале GAP спатрэбіцца адрас вашай электроннай пошты. Ён служыць афіцыйным каналам сувязі з вамі, таму раім пакідаць адрас электроннай пошты, якую вы рэгулярна правяраеце,
- Ва ўсіх раздзелах ёсць абавязковыя і неабавязковыя палі, абавязковыя палі адзначаны зорачкай. Вы не зможаце падаць заяўку, пакуль не будуць запоўнены ўсе абавязковыя палі,
- Электронная заяўка можа быць запоўнена на англійскай, рускай ці беларускай мовах (заяўкі, запоўненыя на іншых мовах, разглядацца не будуць),
- Запоўніўшы ўсе раздзелы і ўказаўшы абавязковыя звесткі, вы зможаце падаць заяўку, націснуўшы на кнопку «Захаваць і адправіць» на апошняй старонцы формы заяўкі. Пасля гэтага заяўка накіроўваецца на разгляд журы, якое ацэньвае заяўкі, і вы больш не зможаце ўносіць у яе праўкі ці падгружаць файлы,
- Калі вы не атрымаеце аўтаматычнага электроннага ліста з пацвярджэннем паспяховай падачы заяўкі, паведаміце аб гэтым праграму MOST+ па электроннай пошце: **infomobility@goethe.de** ,
- Абавязкова падавайце заяўку загадзя (не менш, чым за два месяцы да ад'езду, і за тры, калі вам патрэбна віза), паколькі ацэнка займае пэўны час, а выплата гранта праходзіць працэдуру ўнутранай праверкі,
- Праграма MOST+ ніколі не будзе тэлефанаваць вам на працу і не будзе публікаваць звесткі аб вашым месцы працы, аб вас ці аб вашай стажыроўцы без вашай папярэдняй пісьмовай згоды.

## Якая інфармацыя ўказваецца ў электроннай заяўцы?

| |
|---|
| Праект стажыровак для беларусаў MOST+<br>(уся інфармацыя прадастаўляецца на англійскай, рускай або беларускай мове) |
| Укажыце ваш прафесійны сектар (з шасці прапанаваных у межах праекта стажыроўкі) |
| Асабістыя дадзеныя (раздзел «Звесткі») |
| • Прозвішча, імя (напісанне лацінскімі літарамі як у пашпарце)<br>• Пол<br>• Узрост<br>• Грамадзянства<br>• Краіна пражывання<br>• Паштовы адрас<br>• Электронная пошта<br>• Нумар тэлефона<br>• Звесткі аб месцы працы заяўніка (не абавязкова)<br>Звесткі аб характары вашай працы (самазаняты або індывідуальны прадпрымальнік, наёмны работнік у прыватным або дзяржаўным прадпрыемстве або ў НДА) |
| Падрабязныя звесткі аб праекце стажыроўкі (раздзел «Крытэры») |
| Мэта стажыроўки:<br>• Наладзіць партнёрскія адносіны ў сваёй прафесійнай сферы<br>• Пашырыць міжнародныя прафесійныя кантакты<br>• Распрацаваць сумесныя праекты<br>• Прадставіць сваю працу ці паслугі<br>• Даведацца аб важных дасягненнях у сваім сектары і расказаць шырокай аўдыторыі аб сваёй практыцы<br>• Здзейсніць вучэбна-азнаямленчую вандроўку або візіт па абмене досведам<br>• Прайсці стажыроўку, трэнінг або воркшоп<br>• Іншыя мэты, якія дапамогуць вам інтэгравацца ў еўрапейскія прафесійныя супольнасці |
| Тып вашай стажыроўки:<br>• Удзел у канферэнцыі, кангрэсе, форуме, міжнародным івэнце, іншым галіновым мерапрыемстве<br>• Азнаямленчая вандроўка або вандроўка для абмену досведам<br>• Стажыроўка, трэнінг або воркшоп<br>• Вандроўкі ў некалькі краін ці ў некалькі этапаў<br>• Візіт партнёраў з ЕС<br>• Анлайн мабільнасць<br>• Гібрыдныя ці Іншыя фарматы, якія дапамогуць вам дасягнуць указаных вышэй мэт і не выходзяць за межы праекта |
| Працягласць вашай паездкі |
| Краіна (краіны) прызначэння: спіс з 27 краін ЕС плюс Беларусь (выбар да 3 краін ЕС) |
| Звесткі аб прымаючым баку/партнёры (кантактная інфармацыя і абгрунтаванне выбару прымаючага боку/партнёра, да 10 розных арганізацый на адну стажыроўку) |

| |
|---|
| Падрабязнае апісанне паездкі, у тым ліку план дзейнасці і запланаваныя вынікі (максімальная колькасць знакаў: 4000 разам з прабеламі) |
| Прафесійная значнасць паездкі (мэты і дадатковая вартасць стажыроўкі для вашай прафесійнай дзейнасці і вашага кар'ернага плана) |
| Дадатковая вартасць стажыроўкі для вашай прафесійнай супольнасці (як вы плануеце дзяліцца атрыманым падчас стажыроўкі досведам з іншымі беларускімі спецыялістамі) |
| Доўгатэрміновыя вынікі вашай стажыроўкі |
| Узровень валодання мовай краіны, якую вы выбралі для стажыроўкі / як вы плануеце арганізаваць камунікацыю з прымаючым бокам / партнёрам (-амі)? |
| Выдаткі на праект (карыстайцеся гэтым узорамі бюджэтаў размешчанымі на партале) |
| Дакументы, якія неабходна загрузіць на партал GAP разам з вашай заяўкай |
| Пацвярджэнне ад прымаючай арганізацыі з ЕС аб тым, што яна гатова прыняць вас (напрыклад, звычайны або электронны ліст або іншы афіцыйны дакумент, які пацвярджае, што партнёр/прымаючая арганізацыя згодны прыняць вас у рамках вашай стажыроўкі, па адным ад кожнай прымаючай арганізацыі; праграма канферэнцыі і г.д.) |
| Рэзюмэ. Вы можаце загрузіць сваё актуальнае рэзюмэ або выкарыстоўваць гэты узор рэзюмэ. Гэты стандарт дапаможа вам структураваць інфармацыю і прэзентаваць яе ў максімальна яснай і даступнай форме. У выпадку групавых заявак падаецца рэзюмэ ад кожнага заяўніка. |

## Ацэнка

Ваша заяўка пройдзе некалькі этапаў ацэнкі. На першым этапе правяраецца адпаведнасць заяўкі тэхнічным крытэрам:

- Адпаведнасць заяўніка, краіны прызначэння, тыпу стажыроўкі ўказаным крытэрам;
- Правільнасць запаўнення формы заяўкі і наяўнасць усіх неабходных дакументаў.

Калі ваша заяўка адпавядае тэхнічным крытэрам, яна будзе перададзена на разгляд двум незалежным беларускім экспертам, якія спецыялізуюцца ў вашай прафесійнай сферы. Эксперты ацэняць заяўку ў адпаведнасці з зацверджанымі крытэрамі. У выпадках, калі адзнакі экспертаў будуць разыходзіцца на 35% ці больш, да разгляду будзе прыцягнуты трэці эксперт.

Прыкладна праз адзін месяц з моманту падачы заяўкі вы атрымаеце на электронную пошту апавяшчэнне аб выніках яе разгляду.

| Асноўныя крытэрыі адбору | |
|---|---|
| Прафесійная значнасць стажыроўкі | • Наколькі поўна заяўка апісвае асабістую і прафесійную матывацыю заяўніка?<br>• Наколькі пераканаўча апісана мэта запланаванай стажыроўкі?<br>• Ці мае стажыроўка дадатковую вартасць для прафесійнага росту заяўніка?<br>• Ці існуе прамая сувязь паміж стажыроўкай і сферай прафесійнай дзейнасці заяўніка?<br>• Наколькі актуальная прапанаваная стажыроўка для прафесійнай дзейнасці заяўніка з улікам дадзеных, указаных у яго (яе) рэзюмэ? |
| Мэтазгоднасць і рэалістычнасць праекта стажыроўкі | • Наколькі добра апісаны прапанаваны праект стажыроўкі? Наколькі лёгка можна зразумець ключавыя аспекты стажыроўкі?<br>• Ці адпавядаюць краіна прызначэння і прымаючы бок/партнёр(ы) заяўленым мэтам стажыроўкі? Наколькі яны рэлевантныя ў кантэксце дадзенай стажыроўкі?<br>• Наколькі добра спланавана і арганізавана дзейнасць у рамках стажыроўкі? Павінна быць прадастаўлена штодзённая праграма актыўнасцяў: дасканальна абгрунтавана неабходнасць кожнага дня гэтай праграмы.<br>• Ці адпавядаюць запланаваныя выдаткі актыўнасцям у рамках стажыроўки?<br>• Ці зможа заяўнік эфектыўна камунікаваць з прымаючай арганізацыяй/партнёрам? Ці існуе магчымасць пераадолець патэнцыйныя моўныя бар'еры? |
| Рэзанансны эфект стажыроўкі | • Ці мае стажыроўка дадатковую вартасць для беларускіх калег / прафесійнай супольнасці заяўніка?<br>• Ці апісаў заяўнік, як ён (яна) плануе дзяліцца вынікамі стажыроўкі з іншымі беларускімі спецыялістамі? Неабходна падрабязнае апісанне плана па абмене вынікамі і атрыманым досведам з паездкі, асабліва ад заяўнікоў, якія плануюць доўгатэрміновую мабільнасць. |
| Доўгатэрміновыя вынікі / устойлівасць | • Як заяўнік плануе выкарыстоўваць вынікі стажыроўкі ў доўгатэрміновай перспектыве? |
| Адпаведнасць мэтам / каштоўнасцям праекта | • Наколькі прапанаваная стажыроўка адпавядае мэтам і каштоўнасцям праекта MOST+? |
| Дадатковыя крытэры адбору | |
| Геаграфія і статус | • Ці пражывае заяўнік у нясталічным рэгіёне, сельскай |

| | |
|---|---|
| | мясцовасці ці маленькім горадзе?<br>• Ці пражывае заяўнік у Беларусі? |
| Менш запатрабаваныя краіны | • Ці ўваходзіць выбраная заяўнікам краіна прызначэння ў наступны спіс: Бельгія, Балгарыя, Кіпр, Данія, Эстонія, Фінляндыя, Грэцыя, Венгрыя, Ірландыя, Люксембург, Мальта, Славакія, Славенія, Румынія? |
| Удзел у папярэдніх праграмах MOST | • Ці рэалізаваў заяўнік як мінімум 2 стажыроўкі па практыцы MOST+?<br>• Ці рэалізаваў заяўнік у мінулым праект стажыроўкі ў рамках MOST I ці II і 1 праект стажыроўкі ў рамках праекта MOST+?<br>• Перавага аддаецца заяўнікам, якія раней не ўдзельнічалі ў праграмах стажыроўки MOST I, II або MOST + |
| Адсутнасць роўных умоў | • Ці падвяргаўся заяўнік рэпрэсіям, дыскрымінацыі або несправядліваму абыходжанню? |

| Асноўныя крытэрыі адбору для мабільнасці тыпу Візіты партнёраў з ЕС | |
|---|---|
| Прафесійная значнасць мабільнасці | • Наколькі пераканаўчая мэта запланаванай мабільнасці?<br>• Ці будзе гэтая мабільнасць садзейнічаць дасягненню мэтаў першай мабільнасці ў ЕС?<br>• Ці будзе зваротная мабільнасць садзейнічаць развіццю агульнага праекта паміж беларускімі прафесіяналамі і іх партнёрамі з ЕС? |
| Мэтазгоднасць і рэалістычнасць мабільнасці | • Ці выразна распісана прапанаваная мабільнасць? Ці лёгка зразумець ключавыя аспекты мабільнасці?<br>• Наколькі добра спланаваныя і арганізаваныя мерапрыемствы ў межах гэтай мабільнасці?<br>• Ці з'яўляецца прапанаваны бюджэт выразным, праўдападобным і рэалістычным? Ці адпавядаюць запланаваныя выдаткі мерапрыемствам па мабільнасці?<br>• Ці змогуць партнёры з ЕС эфектыўна камунікаваць са сваімі беларускімі калегамі, знаходзячыся ў Беларусі? Ці пераадольныя будуць патэнцыйныя моўныя бар'еры? |
| Рэзанансны эфект мабільнасці | • Ці падвысіць такая мабільнасць кампетэнцыі беларускіх калегаў/прафесійнай супольнасці заяўніка?<br>• Ці паўплывае такая мабільнасць станоўчым чынам на Беларусь? |

## Змены ў першапачатковым плане мерапрыемстваў (у выключных выпадках)

Можа атрымацца так, што пасля падпісання пагаднення аб прадастаўленні гранта на паездку з Гётэ-Інстытутам або ўжо падчас самой паездкі, удзельнікі сутыкнуцца з нечаканымі прафесійнымі магчымасцямі, якія яны пажадаюць выкарыстаць для дасягнення большай эфектыўнасці мабільнасці або для наладжвання больш цесных і эфектыўных сувязяў з партнёрамі з Еўрасаюза. Калі такія акалічнасці патрабуюць падаўжэння перыяда паездкі, паездку ў краіну ЕС, якая не была прадугледжана ў першапачатковым плане мабільнасці і г.д., **ніякіх адхіленняў ад першапачатковага плана мерапрыемстваў не дазваляецца**, за выключэннем выпадкаў у якіх:

1) тэрмін візы дазваляе працягнуць знаходжанне ўдзельнікаў мабільнасці;
2) такія змены ў першапачатковым плане мерапрыемстваў належным чынам абгрунтаваны і
3) каманда MOST+ дала пісьмовы дазвол на пісьмовы запыт грантаатрымальніка аб зменах у план паездкі.

Любыя дадатковыя выдаткі, якія ўзнікаюць у выніку такіх зменаў першапачатковага плана паездкі (сутkавыя, дадатковыя транспартныя выдаткі або штрафы і г.д.), будуць аплачвацца самім атрымальнікам гранта і ні пры якіх акалічнасцях не будуць пакрытыя і кампенсаваныя Гётэ-Інстытутам.

## Як адбываецца выплата гранта?

У выпадку адабрэння заяўкі з вамі будзе падпісана пагадненне аб прадастаўленні гранта праграмай MOST+. Пагадненне аб прадастаўленні гранта ўстанаўлівае правы і абавязкі атрымальніка гранта (бенефіцыяра) і праграмы MOST+, а таксама ўключае падрабязныя ўмовы прадастаўлення гранта, у тым ліку інфармацыю аб выплаце гранта, парадак пералічэння сродкаў і патрабаванні да справаздач.

Звярніце ўвагу: плацяжы ажыццяўляюцца ў еўра шляхам банкаўскага пераводу. Любыя банкаўскія  камісіі аплачваюцца атрымальнікам гранта. Прадугледжана магчымасць выплаты гранта на стажыроўку трэцім асобам, якія маюць банкаўскі рахунак у еўра. Такая выплата адбываецца пад адказнасць бенефіцыяра пры ўмове падпісання Дазволу на выплату гранта па праграме стажыроўки MOST+ трэцім асобам. У пэўных выпадках выплата гранта будзе ажыццяўляцца наяўнымі ў еўра (напрыклад, рэзідэнтам Беларусі, якія едуць праз Вільню).

Пасля падпісання пагаднення аб прадастаўленні гранта 80% сумы гранта выплачваецца на тое, каб пачаць рэалізацыю стажыроўкі. Астатнія 20% выплачваюцца пасля прадастаўлення справаздачы аб пройдзенай стажыроўцы і яе зацвярджэння праектнай групай.

У выпадку невыканання ўмоў прадастаўлення гранта і патрабаванняў, выкладзеных у пагадненні аб прадастаўленні гранта, бенефіцыяр павінен будзе вярнуць грант праграме MOST+.

## Справаздачы

Бенефіцыяр абавязваецца цягам 2 тыдняў з моманту завяршэння праекта прадставіць першую тэкставую справаздачу з апісаннем вынікаў стажыроўкі і фінансавую справаздачу разам з усімі фінансавымі дакументамі, а праз 4 месяцы даслаць другую тэкставую справаздачу. Астатак сумы фінансавання (максімум 20%) будзе выплачаны пасля падачы і зацвярджэння першай тэкставай і фінансавай справаздачаў.
Структура справаздачы:
1) Першая тэкставая справаздача:
- Апісанне рэалізаванай дзейнасці і дасягнутых вынікаў;
- Дадаткі: тэкст прэзентацыі, прадстаўленай на міжнародным мерапрыемстве; мінімум 3 фатаграфіі, якія паказваюць дзейнасць у ходзе стажыроўкі, фатаграфіі візітовак новых партнёраў з ЕС. Па магчымасці: відэа ці пасты ў сацыяльных сетках, дэманструючыя дзейнасць падчас стажыроўкі.
2) Фінансавая справаздача:
Запоўненая форма з прымацаванымі пацвярджальнымі дакументамі:
- Фактычныя выдаткі: пацвярджэнне выдаткаў (рахункі, пацверджання аплаты; напрыклад, збор за ўдзел у канферэнцыі);
- Суткавыя: доказ таго, што паездка адбылася і доўжылася запланаваную колькасць дзён (напрыклад, пасадачныя талоны, білеты на транспарт, штампы ў пашпарце, мясцовыя квітанцыі або рахункі ў краіне прызначэння з указаннем вашага імя).
За выключэннем формы бюджэту («Фінансавая справаздача»), якая падаецца файлам Excel, усе суправаджальныя дакументы (рахункі-фактуры, білеты, чэкі і да т.п.) павінны быць прадстаўлены ў MOST+ у фармаце PDF.
У выпадку адсутнасці білетаў, заяўнікі, якія едуць у краіну прызначэння і назад з выкарыстаннем уласных транспартных сродкаў, павінны будуць пацвердзіць сваю прысутнасць, даслаўшы наступныя дакументы: (i) штампы ў пашпарце, (ii) пісьмовыя заявы ад прымаючых арганізацыяў у ЕС з пацвярджэннем прысутнасці заяўніка на мерапрыемстве або навучанні, (iii) квіткі і квітанцыі блізкія да датаў пачатку і заканчэння мабільнасці з імем заяўніка, датамі і месцамі транзакцый і (iv) групавыя фатаграфіі заяўніка і арганізатараў з прымаючай арганізацыі ў ЕС у месцы мабільнасці.
3) Другая тэкставая справаздача:
Мы просім удзельнікаў прадставіць другую тэкставую справаздачу праз 4 месяцы пасля вандроўкі з аднаўленымі звесткамі аб тым, чаго ім удалося дасягнуць у выніку стажыроўкі і наколькі ўстойлівымі аказаліся кантакты з новымі партнёрамі.

Узоры тэкставых і фінансавых справаздач прадастаўляюцца пры падпісанні пагаднення аб прадастаўленні гранта.

## Абарона асабістых дадзеных

Падаючы заяўку на атрыманне гранта, вы згаджаецеся на апрацоўку вашых асабістых дадзеных у адпаведнасці з Агульным рэгламентам абароны асабістых дадзеных Еўрапейскага Саюза GDPR, дэкларацыяй Гётэ-Інстытута аб абароне дадзеных і законамі Федэратыўнай Рэспублікі Германія аб абароне асабістых дадзеных (дэкларацыя аб абароне дадзеных таксама ўключана ў форму заяўкі).

## Кантакты

Пытанні адносна ўдзелу ў праекце накіроўвайце на электронную пошту infomobility@goethe.de